*В. І. МЯДЗЯНІК, А. Б. ЖАЙВАРОНАК, Л. М. ГАЙДУКЕВІЧ*

# МАЛАДЗЁЖНЫ РУХ У БЕЛАРУСІ (1918—1930)

Сёння мы з'яўляемся сведкамі знікнення з палітычнай арэны аджыўшых грамадскіх структур і арганізацый і станаўлення новых палітычных партый і рухаў. Адна з прычын гэтага — немагчымасць працаваць у новых умовах, кіруючыся састарэлымі догмамі і традыцыямі. Гэта ў поўнай меры датычыцца і камсамола — да нядаўняга часу адзінай маладзёжнай арганізацыі.

У нашай гісторыі зацвердзіўся дагматычны падыход да ідэнтыфікацыі маладзёжнага руху. Гэта — адна з многіх дажыўшых да нашых дзён гістарычных недакладнасцей. Запоўніць гэты прабел — надзённая задача даследчыкаў маладзёжнага руху.

Варта падкрэсліць, што камсамол з'явіўся тады, калі маладзёжны рух, у тым ліку і ў Беларусі, атрымаў пэўнае развіццё. Кожная палітычная партыя імкнулася стварыць сваю маладзёжную арганізацыю. З першых дзён існавання камсамол уступіў у вострае праціборства з маладзёжнымі арганізацыямі, і ў гэтай барацьбе ён праявіў сябе актыўнай палітычнай сілай. Механізм канкурэнцыі ў маладзёжным руху гістарычнай літаратурай раскрыты слаба і аднабакова. Тут спрацоўвала прымітыўная схема: камсамол — добра, усе астатнія арганізацыі — дрэнна. Неабходна з навуковых пазіцый растлумачыць, чаму і ў сілу якіх абставін камсамол стаў адзінай грамадска-палітычнай арганізацыяй у рэспубліцы і наколькі гэта апраўдала сябе.

Гісторыя маладзёжнага руху, яго вытокі бяруць пачатак у дакастрычніцкім перыядзе, у рэвалюцыйным руху рабочай, сялянскай, перадавой студэнцкай моладзі і навучэнцаў. Ужо тады ў Беларусі дзейнічала вядомая сваім палітычным уплывам юнацкая секцыя «Народнай волі». Яе арганізацыі ўзначальвалі: у Мінску — М. Сарокін, у Магілёве — К. Базлевіч, у Віцебску — І. Шмідовіч [1]. У маладзёжных гуртках вывучаліся рэвалюцыйныя творы, праводзілася агітацыя на вёсцы. Найбольш актыўна гэта работа праходзіла на Палессі пад кіраўніцтвам А. Станкевіча, В. Белавуса, Т. Шулеймана. Тут выдаваліся нават свае друкаваныя органы, у прыватнасці газета «Новый свет», шырока распаўсюджваліся лістоўкі. З-за праследаванняў паліцыі кадры актывістаў часта мяняліся, але пераемнасць у рабоце ўдавалася захаваць [2].

Пільны аналіз новых дакументаў дазваляе больш узважана ацаніць дзейнасць арганізацыі «Труд и свет», якая займае важную старонку ў гісторыі маладзёжнага руху Беларусі. Доўгі час яе лічылі непасрэдным папярэднікам камсамола ў рэспубліцы. У аснову яе дзейнасці было пакладзена ідэйнае выхаванне юнакоў і дзяўчат, вывучэнне гісторыі свайго краю. Уся работа праводзілася ў асноўным у працэсе працы, якая лічылася галоўным крытэрыем чалавечай каштоўнасці. Шмат часу аддавалася тэарэтычнай рабоце, вывучэнню прац вядомых філосафаў, праграм палітычных партый і рухаў. Моладзь упарта шукала сваё месца ў грамадска-палітычным жыцці. Толькі нязначная частка членаў гэтага саюза пайшла за бальшавікамі (усяго 13 %). Многія далучыліся да эсэраў (каля 42 %), кадэтаў (24 %), меншавікоў (17 %)[3]. Кіраўнікі «Труда и света» розных пакаленняў — Н. Казакевіч, А. Друбіч, Н. Міхельсон, К. Стайковіч і інш.— не толькі спрабавалі аб'яднаць моладзь, але і прапагандаваць самабытнасць культуры, звычаяў і традыцый беларускага народа і іх беражлівага захавання.

У ліпені 1920 г. мінская яўрэйская арганізацыя «Паалейцыён», якая існавала з 1914 г., стварыла яўкамол. Арганізацыі яўкамолу з'явіліся ў Бабруйску, Мазыры, Слуцку, Барысаве і іншых гарадах. Разам з такімі негатыўнымі момантамі ў дзейнасці і ідэалогіі яўкамола, як ідэі аб выключных асаблівасцях яўрэйскай нацыі, аб стварэнні яўрэйскага «нацыянальнага ачага», асобных яўрэйскіх саветаў і г. д., былі і прагрэсіўныя намеры аб адраджэнні і захаванні яўрэйскіх традыцый, культуры і нацыянальных каштоўнасцей. Яўкамол узяў шэфства над яўрэйскім нацыянальным тэатрам у Мінску, стварыў сваю бібліятэку [5].

Аднак у хуткім часе яўкамол быў абвінавачаны ў нацыяналізме, у падрыве адзінства беларускага камсамола, а затым і ў контррэвалюцыйнай дзейнасці. Лідэры яго — Е. Цандлер, І. Вырвіч, С. Бруно [6] былі рэпрэсіраваны, а сама арганізацыя аб'яўлена антысавецкай.

Неабходна таксама аб'ектыўна ацаніць тэарэтычныя канцэпцыі «юнацкага сіндыкалізму» і практычную дзейнасць яе прыхільнікаў, якія мелі вя-

лікі ўплыў у Беларусі. Метады іх работы не заўсёды былі апраўданымі: імкненне да падпольнай работы, суб'ектыўныя ацэнкі і неаргументаваная крытыка, фракцыйнасць, супрацьпастаўленне інтарэсаў рабочага класа розных пакаленняў і г. д. Але сама ідэя масавай арганізацыі маладога рабочага класа, «якая ідзе спачатку побач і пад кіраўніцтвам КСМ, а потым і без гэтага кіраўніцтва»[7], пошук самастойных шляхоў развіцця ўяўляецца вельмі цікавай і проста неабходнай.

Так, «сіндыкалісты» г. Слуцка яшчэ ў сярэдзіне 20-х гг. аднымі з першых у рэспубліцы выступілі супраць агульных рэпрэсій партыйных апазіцыянераў. У Мазыры В. Клебановіч, Ю. Суздалеў, І. Кроўша і іншыя лідэры гэтага маладзёжнага руху патрабавалі аб'ектыўнай ацэнкі працэсаў, што адбываліся ў краіне і рэспубліцы, праўдзівага іх асвятлення. Барацьба з Троцкім і яго прыхільнікамі, як паказваюць дакументы, не заўсёды знаходзіла поўнае адабрэнне ў маладзёжным асяроддзі [8]. У пэўнай ступені ў асобе «юных сіндыкалістаў» нараджаўся своеасаблівы пратэст супраць сталіншчыны і звязаных з ёй адмоўных з'яў.

Гэта маладзёжная арганізацыя першай у рэспубліцы паставіла пытанне аб неабходнасці ўліку рэалій бягучага жыцця пры рабоце з юнакамі і дзяўчатамі, аб вызваленні ад агульных, неканкрэтных лозунгаў і вырашэнні канкрэтных задач выхавання і навучання падрастаючага пакалення. Асабліва востра гэта праблема паўстала ў канцы 20-х гг., калі камсамол актыўна ўзяўся за выкананне неўласцівых яму функцый, вырашэнне народнагаспадарчых задач, дубліраванне партыйных пастаноў і іх ажыццяўленне. Любая крытыка з боку ўспрымалася як здрада, як спроба расколу ці закліку да кантррэвалюцыі. Так, пасля публікацыі ў лістападзе 1929 г. у раённай газеце «Светлый путь» артыкула М. Кляменцьева аб памылках у стылі кіраўніцтва ЛКСМБ і празмернай партыйнай апецы камсамола Бюро ЦК гэтай арганізацыі выдала спецыяльную пастанову, дзе даныя думкі называліся паклёпам на гісторыю бальшавізму і пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва [9]. Галоўліт БССР, абапіраючыся на ліст І. Сталіна ў рэдакцыю «Пролетарской революции» аб пралетарскай пільнасці і непрымірымасці да варожых тэорый, патрабаваў ад агітатараў пісаць толькі пра станоўчае, крытыка пры гэтым павінна была быць памяркоўнай [10].

Выконванне гэтых патрабаванняў прывяло да таго, што многія маладзёжныя лідэры падпадалі пад праследаванні і рэпрэсіі. Іх імёны выкрэсліваліся з гісторыі і аўтаматычна ўносіліся ў спісы ворагаў.

Асабліва складана прыходзілася працаваць маладзёжным лідэрам у беларускай вёсцы, дзе ў 1919—21 гг. узнікла вялікая колькасць саюзаў сялянскай моладзі. Гэта быў своеасаблівы адказ на рэзкае падзенне сельскагаспадарчай вытворчасці, зжыўшую сябе палітыку ваеннага камунізму, няўвагу да праблем моладзі. Так, агульны сход Нова-Слежаніцкага маладзёжнага саюза Магілёўскай вобласці 28 жніўня 1920 г. пастанавіў адкрыць у вёсках школы, узяць шэфства над беспрытульнымі дзецьмі, стварыўшы для іх працоўную камуну [11].

У гэтым жа годзе ў горадзе Брагіне была створана маладзёжная арганізацыя «Альтруісты». Галоўнай задачай яна лічыла прапаганду самабытнай беларускай культуры, а пазней — абагульненне і распаўсюджванне вопыту хутарскай сістэмы гаспадарання. У гэтай рабоце было шмат станоўчага, у першую чаргу — імкненне пайсці сваім шляхам, аказаць дапамогу равеснікам у адукацыі, гаспадарчых пытаннях. Аднак хутка дзейнасць гэтай арганізацыі была аб'яўлена шкодніцкай, асабліва ў пытаннях распальвання «нацыяналістычных» настрояў, спачування і рэальнай падтрымкі правых ухілістаў. «Альтруісты» былі разагнаны, а іх лідэры Н. Разумовіч, А. Барысюк, Ф. Доўгі, Л. Апанасюк і іншыя рэпрэсіраваны [12].

У Магілёве з гуртка прапагандыстаў ГАЭЛРО у 1921 г. узнік першы ў краіне маладзёжны тэхнічны клуб. Яго кіраўніком быў В. Веніюкоў. У гэтым клубе маладыя людзі вывучалі асновы электра- і радыётэхнікі, набывалі навыкі практычнай работы. Штогадовыя выстаўкі работ клуба набылі вялікую папулярнасць не толькі ў горадзе, але і ва ўсёй рэспубліцы. Больш паловы былых членаў клуба паспяхова скончылі розныя інстытуты і тэхнікумы, сталі вядомымі спецыялістамі. Доўгі час ЛКСМБ імкнуўся падпарадкаваць гэты клуб сабе, дзейнічаючы нібыта ініцыятар яго стварэння, што не адпавядала рэчаіснасці. В. Веніюкоў і яго паслядоўнікі К. Далідовіч, А. Штраух, Я. Марцінсон адстойвалі сваю самастойнасць і незалежнасць, але нарэшце кіраўніцтвам камсамола рэспублікі былі аб'яўлены раскольнікамі, дэзарганізатарамі і клуб быў закрыты [13].

Доўгі час у гістарычнай літаратуры сцвярджалася, што аздараўленчая і

спартыўна-масавая работа заўсёды накіроўвалася ЛКСМБ і менавіта ён усямерна развіваў і ўмацоўваў яе. Аднак фізкультурныя гурткі, секцыі і спартыўныя клубы спачатку былі створаны пры органах Усенавуча, а затым падпарадкаваны адпаведным камітэтам мясцовых саветаў у рамках Чырвонага саюза па фізічнай культуры. Функцыяніравалі яны па сваіх планах з улікам мясцовых умоў і фінансавых магчымасцей, прычым (па статыстыцы) кіравалі імі, як правіла, беспартыйныя. Камсамол доўгі час спрабаваў уплываць на гэтыя калектывы, дыктаваць ім свае ўмовы. У хуткім часе ўсе поспехі ў спорце былі аб'яўлены заслугай камсамола, а лозунг «У здаровым целе — здаровы дух» быў заменены на «Здаровы рабочы — лепшая апора дыктатуры пралетарыяту». Лідэры ЛКСМБ рашуча выступалі супраць стварэння масавай арганізацыі рабочай моладзі, якая мела б магчымасць канкурыраваць з камсамолам і нават, па меркаванню яго кіраўнікоў, аказваць на моладзь варожы ўплыў.

Значнае месца ў маладзёжным руху рэспублікі займала «Беларускае таварыства ваяўнічых бязбожнікаў», якое ўзнікла ў 1918 г. Яно мела два адгалінаванні. Адно вяло бязлітасную барацьбу з рэлігіяй ва ўсіх яе праявах, удзельнічала ў разбурэнні цэркваў, ганеннях супраць служыцеляў культу. Другое адгалінаванне вывучала асновы рэлігіі і атэізму і спрабавала выкарыстаць іх для духоўнага ўплыву на моладзь. Але паколькі ў той час усё, звязанае з царквой, было аб'яўлена кантррэвалюцыйным, то ў барацьбе з «опіумам для народа» камсамол узначаліў першае, найбольш кансерватыўнае адгалінаванне. Хутка ў абкамаўскіх і райкамаўскіх справаздачах сталі з'яўляцца дадзеныя аб разбураных храмах і царквах і г. д. Спробы другога адгалінавання звярнуць на сябе ўвагу поспеху не мелі, асабліва пасля магутнага наступлення на старую інтэлігенцыю ў канцы 20-х — пачатку 30-х гг. Толькі сёння мы спрабуем зноў вярнуцца да станоўчага вопыту «ваяўнічых бязбожнікаў», шмат у чым ужо незваротна згубленаму.

Камсамольскія лідэры, кіруючыся Праграмай саюза і дырэктывамі партыі, адхілялі ўсялякую мэтазгоднасць стварэння маладзёжных рухаў за межамі камсамола — нават прафесійных, не гаворачы пра грамадска-палітычныя, бо лічылі, што калі яны і маглі існаваць, дык толькі пад кіраўніцтвам РКСМ. Не выпадкова ў рашэннях VI з'езда РКСМ (1924) падкрэслівалася, што камсамол павінен стаць «школай ваяўнічага бальшавізму... не дапускаць у маладзёжных рухах ніякіх апартуністычных плыняў, бязлітасна змагацца з імі»[14].

Вопыт сведчыць, што наяўнасць адной усеабдымнай арганізацыі моладзі не садзейнічае развіццю юнацкага руху. Імкненне да гегеманізму, таталітарызму, узурпацыі ўлады не магло даць моладзі магчымасці для самавыражэння, творчасці, рэалізацыі многіх карысных пачынанняў, якія ўзыходзілі з глыбіні мас, а не зверху, у выглядзе дырэктыўных указанняў. Новыя маладзёжныя рухі ў рэспубліцы павінны ўлічваць вопыт сваіх папярэднікаў і рэаліі сённяшняга дня.

[1] ЦДАКР БССР. Ф. 265, воп. 1, спр. 4531, арк. 293—295, 303—310.
[2] Там жа. Спр. 4533, арк. 312—315.
[3] Там жа. Спр. 4535, арк. 98—118; 296—299.
[4] ДА БССР. Ф. 19, воп. 2, арк. 94—118; 215—221.
[5] Там жа. Спр. 98, арк. 16—34; 56—61.
[6] Там жа. Арк. 73—85; 95—97.
[7] ЦДАКР БССР. Ф. 31, воп. 1, спр. 425, арк. 42—54.
[8] Там жа. Ф. 67—71.
[9] Там жа. Ф. 63, воп. 2, спр. 590, арк. 4—5.
[10] Там жа. Арк. 11—13.
[11] ДА БССР. Ф. 19, воп. 2, спр. 97, арк. 37—54.
[12] Там жа. Воп. 3, спр. 5, арк. 31—48.
[13] ЦДАКР БССР. Ф. 265, воп. 1, спр. 4546, арк. 19—33.
[14] Позывные истории. Вып. 10. М., 1991. С. 70—71.

*И. П. ДЕЛЕНДИК*

## О НЕКОТОРЫХ ОСОБЕННОСТЯХ ШКОЛЬНЫХ РЕФОРМ ПРАВИТЕЛЬСТВА ЦАРСКОЙ РОССИИ В СЕВЕРО-ЗАПАДНОМ КРАЕ В НАЧАЛЕ 60-х гг. XIX в.

Особенности проведения школьных реформ в конце 50 — начале 60-х гг. XIX в. в Северо-Западном крае [1] обусловлены национальным составом и конфессиональной принадлежностью населения. Эти реформы сопровождались